# Навіны

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 7 (24) верасень 2000 г.


## ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

***У Менску***

Сьткаваньне ў Менску пачалося з эксцэсу – удзень памяшканьне Ўправы БНФ было блякаванае міліцэйскімі машынамі, машыну з АМАПам падагналі і ва ўнутраны дворык Управы. Аднак праз некалькі гадзінаў міліцыянты адступілі, пакінуўшы толькі некалькі групаў вонкавага назіраньня на падыходах да памяшканьня.

Нагадаем, што 8 верасьня як Дзень беларускай вайсковай славы ў незалежнай беларусі сьвяткуецца ўжо дзясяты год. Сёлета меркавалася шырока й урачыста адзначыць гэтае сьвята. Адпаведную заяўку падалі 23 жніўня ў Менгарвыканкам прадстаўнікі БНФ Юры Хадыка й Віктар Івашкевіч. У заяўцы былі пазначаныя і шэсьце да помніка Янку Купалу цэнтральнай часткай праспэкта Скарыны, і вялікая канцэртавая праграма. Аднак улады сьвята забаранілі.

Тым ня менш, ніхто ня можа забаpаніць ускласьці кветкі да помнікаў ды пасьпяваць песьні ў парку. Таму 8 верасьня, як і меркавалася, у 18.00 да помніку Перамогі на Пляцы Перамогі людзі ўсклалі кветкі й вянкі ў памяць беларускіх жаўнераў, што на працягу ўсёй гісторыі аддавалі жыцьці за свабоду краіны. На ўрачыстай цырымоніі былі старшыня БНФ Вінцук Вячорка, намесьнікі старшыні Юры Хадыка, Вячаслаў Сіўчык, Алесь Бяляцкі, старшыня Маладога Фронту Павал Севярынец, прадстаўнікі іншых дэмакратычных арганізацыяў. Вядомы музыка Ўладзімер Бярбераў іграў на дудзе старажытныя беларускія мэлёдыі. Праблемаў зь міліцыянтамі не было, хаця спачатку тыя былі перакрылі падземны пераход на пляцы Перамогі й не прапускалі да помніку людзей, але потым,

*Працяг на стар.3*



Фота Irex/ProMedia

## Назіральнікаў ня будзе

***30 жніўня ў Вене адбылася тэхнічная канфэрэнцыя АБСЭ, яе Парлямэнцкай Асамблеі, Парлямэнцкай Тройкі Эўрапарлямэнту. На канфэрэнцыі таксама прысутнічалі (упершыню) прадстаўнікі СНД і яе Парлямэнцкай Асамблеі.***

Ад дэлегацыі беларускай апазыцыі на канфэрэнцыі АБСЭ выступілі прадстаўнікі КРДС Анатоль Лябедзька і Вінцук Вячорка. Ад урадавага боку - намесьнік міністра замежных справаў С. Мартынаў.

Пасьля выступаў пачалося абмеркаваньне беларускага пытаньня, якое адбывалася ўжо без удзелу беларускіх дэлегацыяў. У выніку абмеркаваньня былі прынятыя заключныя рэкамэндацыі, у якіх, насуперак дамаганьням Лукашэнкі, Расеі й дэлегацыі СНД, няма мовы пра прысланьне міжнародных назіральнікаў. Адznačae, што плянуецца Эўропай – гэта прысланьне місіі тэхнічнай ацэнкі сытуацыі пад эгідай Бюро правоў чалавека АБСЭ. Пункт 8 "Вынікаў і рэкамэндацыяў Трэцяй тэхнічнай канфэрэнцыі" гаворыць: "Прысутнасьць місіі тэхнічнай ацэнкі ад Парлямэнцкай Тройкі і Бюро правоў чалавека АБСЭ падкрэсьлівае палітычную значнасьць таго, што Эўропа далучаецца да разьвіцьця й кансалідацыі дэмакратыі ў Беларусі. Прысутнасьць у Беларусі місіі з нагоды парлямэнцкіх выбараў не азначае міжнароднага прызнаньня дэмакратычнага характару й вынікаў працэсу парлямэнцкіх выбараў".

Як заявілі кіраўнікі апазыцыі, яны ацэньваюць вынікі канфэрэнцыі як свой бясспрэчны посьпех.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

vytoki.net

## Памятка ўдзельніку кампаніі Байкот - 2000

Трэба ведаць, што

1. Збор подпісаў не падпадае пад адміністрацыйную адказнасьць. **Таму ўсе затрыманьні за збор подпісаў зьяўляюцца незаконнымі і павінны абскарджвацца ў органы пракуратуры альбо суд у адпаведнасьці з Арт. 246 КаАП РБ (калі вы ня ведаеце, як гэта робіцца, мы дапаможам вам гэта зрабіць).**

**2. Да адміністрацыйнай адказнасьці могуць прыцягнуць за *"распаўсюджваньне друкаванай прадукцыі, якая выраблена з парушэньнем устаноўленага парадку і ня мае выходных дадзеных, зьмест якой скіраваны на прычыненьне шкоды дзяржаўнаму й грамадзкаму парадку"*. Гэта Арт. 172 КаАП РБ.** Ён прадугледжвае адміністрацыйнае спагнаньне ў выглядзе папярэджаньня альбо штрафу ў памеры 5 мінімальных заробкаў.

Гэты штраф Вам кампэнсуюць!

**3. Калі Вас затрымала міліцыя, вы павінны ведаць, што:**

У выніку адміністрацыйнага затрыманьня складаецца пратакол адміністрацыйнага затрыманьня і пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні. Вас павінны азнаёміць з пратаколамі. Вы маеце права падпісаць альбо не падпісваць іх, пісаць ці не пісаць уласныя тлумачэньні. Заўсёды памятайце, што даказваць віну павінны яны, а ня Вы.

**Час адміністрацыйнага затрыманьня пачынаецца з моманту дастаўкі ў памяшканьне РАУС ці іншае службовае памяшканьне.** Час адміністрацыйнага затрыманьня можа працягвацца ня больш за 3 гадзіны. **Калі затрыманьне працягваецца больш за тры гадзіны, патрабуйце неадкладнага складаньня пратаколу і абавязкова запішыце гэта ў пратаколе, а таксама неадкладна напішыце скаргу на імя начальніка РАУС і ў раённую пракуратуру.**

**Справу аб адміністрацыйным правапарушэньні паводле Арт. 172 КаАП РБ разглядаюць** *толькі* адміністрацыйныя камісіі пры раённых адміністрацыях. **Да адміністрацыйнай адказнасьці можна прыцягнуць на працягу двух месяцаў з моманту зьдзяйсьненьня адміністрацыйнага правапарушэньня.**

Пры разглядзе справы вы маеце права заяўляць хадайніцтвы, прадстаўляць доказы, задаваць пытаньні сьведкам, знаёміцца з матэрыяламі справы, карыстацца паслугамі адваката.

Аб усіх выпадках затрыманьня неадкладна паведамляйце

праз т. 2134352 у Менску,

ці на пэйджэр

т. 2118585, абанэнт 8082

МЫ ВАМ ДАПАМОЖАМ!



# Асноўным пытаньнем Сойму БНФ стала восеньская палітычная кампанія

***9 верасьня абыўся чарговы, верасьнёўскі Сойм БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ. Асноўны акцэнт падчас Сойму быў зроблены на дзейнасьці БНФ і ўсёй аб'яднанай апазыцыі ў рамках кампаніяў Байкот – 2000 і Народны Рэфэрэндум.***

З дакладам на тэму "БНФ і кааліцыя" выступіў старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Значная ўвага была ўдзеленая выступоўцам нядаўнім рашэньням тэхнічнай канфэрэнцыі АБСЭ, якая прайшла 30 жніўня ў Вене. Як зазначыў сп. Вячорка, "венскія рашэньні - адназначна на карысьць дэмакратычных сілаў, бо гаворкі пра міжнародных назіральнікаў быць ужо ня можа". Акрамя ўсяго, былі адзначаныя тэндэнцыі падзеньня рэйтынгу Лукашэнкі: апошнія сацыялягічныя апытаньні сведчаць, што менш за 50% людзей гатовыя ісьці на выбары, калі ня будуць выкананыя вядомыя 4 ўмовы АБСЭ.

Намесьнік старшыні БНФ Віктар Івашкевіч правёў інструктаж рэгіянальных лідэраў Фронту наконт правядзеньня кампаніі Байкот – 2000 у рэгіёнах: правядзеньне пікетаў, абыход кватэраў, збор подпісаў за 4 ўмовы АБСЭ. Было падкрэслена, што байкот выбараў ня ёсьць парушэньнем закону.

Акрамя гэтых пытаньняў, на Сойме Партыі БНФ былі разгледжаны вынікі арганізацыйнай працы ўлетку: аб'езд рэгіёнаў, павелічэньне колькасьці сяброў партыі і колькасьці партыйных структураў у краіне.

Сакратарыят Управы выказаў незадавальняльную ацэнку стану рэгістрацыі абласных арганізацыяў Партыі БНФ.

**Аляксей ШЭІН**



# Пастанова Сойму Партыі БНФ Аб актыўным байкоце выбарчага фарсу

Прызначаныя Лукашэнкам на 15 кастрычніка сёлета выбары ў «палату прадстаўнікоў» зьяўляюцца фарсам, спэктаклем, скіраваным на падман міжнароднай супольнасьці й захаваньне прамаскоўскага рэжыму. Для прызнаньня парлямэнцкіх выбараў у Беларусі свабоднымі й дэмакратычнымі апазыцыя й міжнародная супольнасьць вылучылі 4 ўмовы: будучы паралямэнт павінен быць паўнаўладным заканадаўчым органам; выбарчае заканадаўства мае гарантаваць суцэльную празрыстасьць падліку галасоў і недапушчэньне фальсыфікацыяў. Партыя БНФ лічыць вельмі важным для дэмакратычнасьці выбараў укараненьне іх прапарцыйна-мажарытарнага прынцыпу; апазыцыйныя партыі павінны мець рэгулярны бесцэнзурны доступ да дзяржаўных мас-мэдыяў; у краіне павінны зьмяніцца палітычны клімат, г. зн. вызвалены палітычныя вязьні й гарантаваны правы й свабоды чалавека. Ніводная з чатырох умоваў рэжымам дэманстратыўна не была выкананая.

У гэтай сытуацыі Партыя БНФ, паводле рашэньняў V і VI Зьездаў БНФ «Адраджэньне» і IV Кангрэсу дэмакратычных сілаў, пацьвярджае свой няўдзел у выбарчым фарсе і ў складзе аб'яднанай дэмакратычнай апазыцыі праводзіць яго актыўны байкот. Удзел асобных дзеячоў іншых партыяў, што ўваходзяць у КРДС у лукашэнкаўскім палітычным сцэнары парушае рашэньне IV Кангрэсу дэмакратычных сілаў і спрыяе легітымізацыі вынікаў дзяржаўнага перавароту 1996 г.

Партыя БНФ заклікае грамадзянаў Беларусі не хадзіць на выбарчыя ўчасткі 15 кастрычніка. Гэтыя псэўдавыбары – марная трата народных грошай на фармаваньне безуладнай дэкаратыўнай «палаткі», якая нічога ня зробіць для паляпшэньня сытуацыі ў краіне, але будзе выкарыстана для зьнішчэньня незалежнасьці Беларусі праз ратыфікацыю чарговых саюзных дамоваў.

Партыя БНФ у складзе аб'яднанай апазыцыі зьбірае подпісы грамадзянаў у падтрымку дэмакратычных умоваў выбараў, ладзіць масавыя акцыі ў бальшыні гарадоў Беларусі, рыхтуючыся да адказных палітычных кампаніяў 2001 году.

**Менск**

**26 жніўня 2000 г.**

пачатак на стар. 1

# ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

атрымаўшы загад, вымушаныя былі прапусьціць удзельнікаў сьвяткаваньня.

Пясьля ўскладаньня кветак невялікае шэсьце рушыла праспэктам Скарыны да парку імя Янкі Купалы, дзе адбыліся выступы Канфэдэрацыі вайкова-гістарычных клюбаў "Lithuania&Ruthenia". Яны прыгожа інсцэнавалі саму бітву пад Воршай 1514 году, калі ўтрая меншае беларускае войска перамагло маскоўскіх захопнікаў. Пасьля рыцараў выступілі барды Пётра Русаў, Зьміцер Сідаровіч і Андрэй Латушкін – сьпяваючы песьні проста пад гітару, безь мікрафонаў, бо з прычыны забароны канцэрту карыстацца гукаўзмацняльнай апаратурай было немагчыма. Паказалі сваё майстэрства і "Старалітва" ды "Контрданс" - гурты, якія граюць старажытную беларускую музыку. Імпрэза атрымалася.

На гэты раз сьвята прайшло спакойна, ня гледзячы на сьцягнутыя сілы міліцыі, АМАПу ды спэцслужбаў. 8 верасьня народ "адваяваў" і помнік Перамогі, і парк Купалы. Тое, што рэжым ня змог перашкодзіць, гаворыць выключна пра няўпэўненасьць ды боязь, якія гэты рэжым пачаў адчуваць з пачаткам палітычнай восені.



*У Магілёве*

Сьвята 8 Верасьня тут адзначылі канцэртам у памяшканьні Магілёўскай аранізацыі БНФ, дзе выступілі мясцовыя барды.

Пасьля канцэрту людзі, узяўшы з сабою улёткі "Байкот – 2000" (улёткі на шляху раздаваліся прахожым), скіраваліся на месца былых Шляхецкіх могілак (цяпер гэта парк у цэнтры Магілёва). У сквэры «40 год Пеарамогі» быў запланаваны канцэрт, але напярэдадні арганізатары атрымалі адмову мясцовых уладаў. Прычына забароны канцэрту аказалася надзвычай простаю: нібыта праграма канцэрту і аздабленьне пляцоўкі не былі прадастаўленыя ў гарвыканкам.



Старшыню Магілёўскай абласной арганізацыі БНФ Анатоля Фёдарава затрымалі ў цэнтры гораду. У пастарунку на яго склалі пратакол аб правядзеньні несанкцыянаваннай масавай акцыі, і пасьля адпусьцілі, прызначыўшы суд на панядзелак.

*У Баранавічах*

8 верасьня з 16.00 да 18.00 Баранавіцкая арганізацыя БНФ "Адраджэньне" праводзіла пікет, прысьвечаны Дню беларускай вайсковай славы. На самым пачатку акцыі пад нацыянальнымі сьцягамі былі ўскладзеныя кветкі да вечнага агню й да помніку С. Грыцаўцу.

Падчас пікету ў Маладым Парку было раздадзена больш за 2000 асобнікаў газэты "Рабочы", у якой распавядалася пра перамогу пад Воршай. Патрыёты трымалі плякаты "Слава героям Воршы!", "Беларус! Вывучай сваю гісторыю! Шануй сваіх герояў!"

**Прэсавая група БНФ «Адраджэньне» й Паптыі БНФ**

# Міністэрства Юстыцыі віншуе Малады Фронт з днём нарадзінаў

6 верасьня найбуйнейшаму апазыцыйнаму маладзёваму руху афіцыйна спаўняецца тры гады з дня нараджэньня: у 1997 годзе менавіта ў гэты дзень прайшоў Устаноўчы Сойм агульнабеларускага Маладога Фронту.

Між тым, Міністэрства юстыцыі Беларусі, у якое тры з паловай месяцы таму МФ падаў дакумэнты на рэгістрацыю, аніяк ня можа нарадзіць хоць якога адказу – ці будзе легалізаваная арганізацыя, ці застанецца напаўпадпольнай.

31 жніўня скончыўся чарговы тэрмін разгляду – правак, унесеных у Статут Маладога Фронту ІІІ Соймам, а Міністэрства юстыцыі маўчыць, быццам юнак на допыце.

Сытуацыя беспрэцэдэнтная: за 110 дзён разгляду (законна адзведзена толькі 30) Упраўленьне па справах грамадзкіх аб"яднаньняў (кіраўнік М. Сухінін) так і ня вырашыла, што лепш: або дазволіць маладафронтаўскую дзейнасьць ува ўсёй Беларусі (страшна), або афіцыйна забараніць, і фактычна стварыць масавае маладзёвае незалежніцкае падполье (увогуле жах). Такім чынам, юрыдычны дзень нараджэньня МФ адкладаецца.

Але пытаньнем рэгістрацыі МФ цікавіцца Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ ў Беларусі. Мішэль Рывальe, намесьнік Ганса-Георга Віка, паведаміў, што місія ўважліва сочыць за маўчаньнем Міністэрства юстыцыі.

**Мікалай ГРЫГАРОВІЧ**

пачатак у № 6 (23)

# МАЛАДЫ ФРОНТ ПЕРАМЕНАЎ

*Каб зьдзейсьніць пастаўленыя задачы, Маладому Фронту будзе неабходна*

## ПЕРААДОЛЕЦЬ НЕБЯСЬПЕЧНЫЯ ВЫКЛІКІ

**НЯНАВІСЬЦЬ.** Нянавісьць да Лукашэнкі, Расеі, амапаўцаў ці сваіх "несьвядомых" суайчыньнікаў не павінна рабіцца асноўнай рухавай сілай моладзевага супраціву. Сутнасьць моладзевага нацыянальнага руху – у свабодзе й праўдзе, веры й любові, і менавіта гэтыя сілы вядуць нас у змаганьні за нацыянальную ідэю. Мы змагаемся не супраць кагосьці, а ЗА Беларусь; за беларускі народ.

**АБМЕЖАВАНАСЬЦЬ.** Абмежаванае разуменьне ролі МФ у сёньняшнім нацыянальным руху можа прывесьці да імкненьня ўладкавацца ў "сваёй" утульнай нішы (напрыклад, "мы кансэрватары", "мы культурнікі" або "мы радыкалы"). Адсюль, ад абмежаванасьці – і нецярпімасьць асобных групаў моладзі ўнутры руху, якой неабходна пазьбягаць. Сэнс агульнабеларускага моладзевага нацыянальнага руху моладзі ў тым, каб арганізацыйна й духова аб'яднаць усе магчымыя маладзёвыя плыні й групы на аснове нацыянальнае ідэі. МФ займаецца і грамадзкай дзейнасьцю, і палітычнымі пытаньнямі; у МФ ёсьць месца ўсім – але пры гэтым у цэнтры ўвагі, у сарцавіне ідэалёгіі павінна стаяць выразная сыстэма каардынатаў: імкненьне ў Эўропу, незалежная дзяржава, перамены ў грамадзтве, хрысьціянскія прынцыпы. Ніякая з маладзёвых арганізацыяў, апроч МФ, сёньня ня ў стане задзіночыць беларускую моладзь у нацыянальны рух. Калі ня мы – дык хто?

**АБЫЯКАВАСЬЦЬ.** Многія, сьпярша юныя ды гарачыя, расчароўваюцца ў адсутнасьці хуткага эфэкту, робяцца абыякавымі ды спустошанымі, адыходзяць ад справаў альбо працягваюць квола варушыцца "па інэрцыі" ці "па звычцы": "усё роўна нічога не мяняецца". Тым часам Беларусь мяняецца – паволі, але ўпэўнена. Трэба сталець і разумець, што сапраўдная незалежнасьць і духовае Адраджэньне ніколі не даюцца лёгка, за пару гадоў. Мы маладыя, поўныя сілаў, за намі будучыня – і менавіта на нас ляжыць адказнасьць за перамены ў грамадзтве. Кожная хвіліна, кожны дзень нашага змаганьня мусяць набліжаць нас да перамогі. У такі час недапушчальна расслабляцца, драмаць ці спадзявацца на іншых. Будзьма ж заўжды бадзёрымі, чуйнымі, моцнымі аптымістамі – і моладзь за намі пойдзе!

## ПЭРСПЭКТЫВА РЭФОРМАЎ

Малады Фронт ужо цяпер павінны рыхтавацца да магчымае зьмены ўлады й разгортваньня шырокіх рэформаў. Трэба разумець, што толькі масавы, агульнабеларускі нацыянальны рух моладзі здольны будзе стаць рухавіком пераменаў. Таму пэрспэктыва МФ – пераўтварэньне ў найбуйнейшую, разьлічаную на некалькі соцень тысячаў чалавек, сыстэму нацыянальных праграмаў і ініцыятываў: ад адукацыі да занятасьці, ад шоў-бізнэсу да экалёгіі.

Запачаткоўваньне такога грандыёзнага руху – справа сёньняшняга часу. Малады Фронт ужо зараз павінны адпрацоўваць мадэлі й мэханізмы будучых кампаніяў і акцыяў шматтысячнага агульнабеларускага маштабу – газэты й канцэрты, шоў беларушчыны й сэмінары, экалягічныя мерапрыемствы й PR-эфэкты, спартовыя турніры й Web-сайты – каб потым заставалася толькі раскручваць удасканаленыя, "фірмовыя"



узоры й тэхналегіі. На сёньня для распачынаньня нацыянальнага руху моладзі дастаткова адзінае дзейснае суполкі зь 5 – 10 чалавек у школе ці факультэце, двары або мястэчку. Ну, а раскрутка ва ўмовах рэформаў – справа тэхнікі. Недалёкі той час, калі паседжаньні раённых радаў МФ будуць адбывацца ў актавых залях і кінатэатрах, з праглядамі фільмаў і канцэртамі. Студыі й офісы, друкарні й кабінэты, будынкі й стадыёны – усё гэта ў Маладога Фронту будзе, калі мы самі будзем гатовыя працаваць з усёй моладзьдзю на агульнабеларускім узроўні.

Грандыёзны фронт пераасэнсаваньня сьветапогляду, уздым нацыянальнае сьвядомасьці й духовага абуджэньня, які 10 гадоў таму суправаджаў руйнаваньне савецкай імпэрыі зла, сёньня выразна выяўляецца як у асобных мясьцінах, у розных слаёх насельніцтва, так і ва ўзросьце – у пакаленьнях моладзі.

У пэрспэктыве рэформаў Малады Фронт ставіць на сьветапоглядныя й духовыя перамены. Менавіта такія перамены даюць сілы на глябальнае ператварэньне нацыям, грамадзтвам і цывілізацыям. Менавіта зь іх пачынаюцца палітычныя й эканамічныя, сацыяльныя і культуровыя рэформы. Духовае Адраджэньне, вяртаньне да хрысьціянскіх вытокаў, найвышэйшых каштоўнасьцяў веры й любові дае людзям веру ў саміх сябе, у свае сілы, у сваю краіну і любоў да свайго бліжняга, да кожнага суайчыньніка, любоў, здольную аб'яднаць увесь народ і ўзвысіць яго да нацыі. Таму сёньня, на пераломе тысячагодзьдзяў, фундамэнтальнай задачай нацыянальнага руху моладзі ёсьць усебаковая падтрымка беларускіх хрысьціянскіх канфэсіяў у атмасфэры верацярпімасьці й узаемапавагі, разьвіцьцё й пашырэньне сярод моладзі прыярытэтаў духовасьці, эўрапейскасьці ў нацыянальным гучаньні.

Глябальная зьмена бездухоўнага й агрэсіўнага, упадніцкага, імпэрска-правінцыйнага ладу жыцьця на дзяржаўніцкі, аптымістычны, стваральны, эўрапейскі духовы вобраз мысьленьня й дзеяньня вызваляе ў грамадзтве аграмадныя сілы. Патэнцыял абуджанага, ахопленага прагаю зьменаў і энтузіязмам грамадзтва, на парадак вышэйшы за магчымасьці дзяржаўна-адміністрацыйнай сыстэмы ці мільярдныя замежныя крэдыты. І ў першую чаргу гэта важна для моладзі, якой заўтра жыць.

Самае першае, што мы зробім, калі прыйдзем да ўлады – зьменім выдуманую, фальшывую чырвона-зялёную сымболіку на нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг і Пагоню. Гэта будзе найлепшы сыгнал для ўсіх і кожнага, знак рэформаў і Адраджэньня па-над дахамі гарадоў і вёсак, арыенцір для ўсяго грамадзтва й Захаду – ён пакажа, што з савецкай дыктатурай і каляніяльнай эпохай тут скончана раз і назаўжды. Аўтаматычна адмяняюцца ўсе "саюзы", драконаўскія дэкрэты, прапіскі й абавязковы прызыў, аднаўляецца дзеяньне Канстытуцыі. Мы усталюем нармалёвую мяжу з Расеяй – і шырока распахнем дзьверы на Захад. Мы разгорнем беспрэцэдэнтную, маштабовую кампанію сапраўдных рэформаў, асноўнай рухавай сілай якіх стане моладзь.

Найважнейшай задачай на гэтым этапе будзе арганізацыя беспрэцэдэнтнае рэклямы, раскруткі рэформаў дзеля абуджэньня масавага энтузіязму й актыўнага удзелу ў правядзеньні пераменаў усяго грамадзтва. Кампаніі ў сродках масавай інфармацыі, найшырэйшыя маладзёвыя праграмы, арганізацыя паўсюдных грамадзкіх работаў павінныя будуць данесьці сэнс рэформы да кожнага, растлумачыць сутнасьць, патрэбу й прывабнасьць пераўтварэньняў усім жыхарам краіны.

**МАЛАДЫ ФРОНТ – НАПЕРАД!**

## III. НАШ ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ

Малады Фронт бачыць нашую краіну ня проста сярэднеэўрапейскай і дэмакратычнай. Нам патрэбная Вялікая Беларусь. Малады Фронт — ЗА БЕЛАРУСЬ як стратэгічны мост паміж Захадам і Расеяй, між Эўропай і Ўсходам, навуковы, тэхналягічны, сэрвісны й інфармацыйны цэнтар сусьветнага ўзроўню, такі, як Бэльгія, Сынгапур ці Каліфорнія; найбуйнейшы фінансавы рынак між Азіяй і Эўропай. ЗА БЕЛАРУСЬ — агмень культуры, уплывы якога сягаюць на палову кантынэнту, за духовае сэрца Ўсходняй Эўропы, прастору сьвятла, веры й любові ў месцы сустрэчы хрысьціянскіх канфэсіяў.

### 1.НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

1.1.Нацыянальная ідэя — гэта місія, прадвызначэньне, сэнс існаваньня народу. Любая нацыянальная ідэя абумоўленая адпаведнай гісторыяй, тэрыторыяй, часам, мэнталітэтам, узаемадачыненьнямі з суседзямі. Спазнаньне, адчуваньне гэтага найвышэйшага, Богам дадзенага наканаваньня, усьведамленьне сваёй унікальнасьці й непаўторнасьці, свайго прызначэньня менавіта на гэтай зямлі, у гэты час і ёсьць нацыянальнай ідэяй. З пачуцьця нацыянальнае саматоеснасьці вынікаюць і любоў да роднае краіны, і павага да іншых народаў, і разуменьне сваёй адказнасьці перад тымі, хто быў — за тых, хто будзе пасьля.

1.2.Адміністрацыйнай моўна-культурніцкай беларусізацыі 1992-94 гг. акапалася для вяртаньня нацыянальнае сьвядомасьці яўна недастаткова. Сёньняшні час вымагае ад нас куды больш глыбокае й шматвобразнае сьветапоглядные дзейнасьці, ажыцьцяўленьня сапраўднага Духовага Адраджэньня. Задача новага, нашага пакаленьня незалежніцкага руху — абудзіць самае сьвятое ў душах і сэрцах моладзі, дайсьці да першакрыніцаў нацыянальнага пачуцьця.

1.3.Уся Заходняя цывілізацыя вось ужо 2000 гадоў будуецца на хрысьціянскіх прынцыпах — таму сапраўды эўрапейская Беларусь можа паўстаць толькі з магутным духовым рухам, са сьветапоглядным абнаўленьнем усяго грамадзтва, і, у першую чаргу, маладзёвага. Сёньня беларуская нацыянальная ідэя бачыцца нам як самарэалізацыя народу Рэспублікі Беларусь у найважнейшых формах — незалежнай дзяржаве, мове, сучаснай культуры, дасягненьні дабрабыту, паважных міжнародных стасунках — на падставе духоўнага, хрысьціянскага зьместу.

1.4.Сапраўды, беларускі нацыянальны рух унікальна хрысьціянскі ў сваёй сутнасьці. Гэта яскрава выражана й ў нашых сьвятых сымбалях — бел-чырвона-белым сьцягу Хрыста, белай палатніне з крывёю ўкрыжаванага Ісуса, у духовым гімне "Магутны Божа", у "Пагоні" з крыжом Эўфрасіньні на шчыце — і ў перамозе беларускага духу над злом усіх акупацыяў, войнаў, імпэрыяў і дыктатураў. Гэтае найвышэйшае вымярэньне нацыянальнае ідэі вядзе нас і ў ахвярным змаганьні за нашу краіну, і ў штодзённай працы сярод людзей, надае нам трываласьці, чысьціні й веры там, дзе для іншых балюча, брудна ці страшна. Вось чаму для нас БЕЛАРУСЬ — ГЭТА СЬВЯТОЕ.

1.5. У Беларусі, якая спрадвеку знаходзіцца на геапалітычным скрыжаваньні, сумежжы цывілізацыяў і культураў, нацыянальная ідэя спалучае многія этнічныя й сьветапоглядныя элемэнты. Мы падтрымліваем усе нацыянальныя меншасьці краіны (у тым ліку й расейскую дыяспару як меншыню) у іх праве ствараць шматстайнасьць і шматаблічнасьць беларускага грамадзтва. У сваю чаргу, і старажытнае паганства, і іншыя рэлігіі, і нават атэізм толькі дапаўняюць асноватворна хрысьціянскую беларускую нацыянальную ідэю. Беларусь усёй сваёй гісторыяй сьцьвярджае ідэал верацярпімасьці й узаемапавагі ў іхным суіснаваньні.

*(далей будзе)*

# ФРОНТ: АД РУХУ ДА ПАРТЫІ

***Актуальная палітычная сытуацыя ў краіне ставіць перад усёй апазыцыяй, і ў першую чаргу перад Фронтам, шэраг канкрэтных тактычных задачаў: мабілізацыя арганізацыйных магчымасьцяў дзеля правядзеньня восеньскай кампаніі вулічных акцыяў, байкатаваньне псэўдавыбараў, распрацоўка й ажыцьцяўленьне праграмы дзеяньняў па падрыхтоўцы да магчымых выбараў прэзыдэнта Беларусі ў наступным годзе й інш. Выкананьне гэтых задачаў мае выключна важнае значэньне, паколькі падзеі восені – 2000 будуць дыктаваць палітычныя зьмены (ці палітычны застой) цягам некалькіх наступных гадоў.***

Разам з тым, мы ня мусім забывацца на тое, што, фактычна, адзіным сродкам дасягненьня стратэгічных мэтаў Фронту ёсьць атрыманьне й утрыманьне ўлады ў краіне. А паколькі суб'ектамі змаганьня за ўладу ёсьць палітычныя партыі (прынамсі, будуць пасьля падзеньня рэжыму), натуральным чынам вынікае неабходнасьць пабудовы структураў і самаўсьведамленьня Фронту менавіта як партыі.

Кожная палітычная партыя імкнецца да атрыманьня й ажыцьцяўленьня ўлады. Гэта адзін з чатырох чыньнікаў партыі. Іншыя, паводле вызначэньня, наступныя: наяўнасьць арганізацыйнае структуры, жаданьне забясьпечыць сабе падтрымку народа й прысутнасьць асаблівага бачаньня сьвету, грамадзтва й чалавека (наяўнасьць ідэалёгіі). Аналізуючы дзейнасьць нашае арганізацыі ў супастаўленьні з названымі чыньнікамі мы павінныя канстатаваць, што сутнасна Фронт застаецца хутчэй грамдзкім аб'яднаньнем, чым партыяй. З аднаго боку, прывід "нацыянальна-вызвольнага руху", які вельмі складана карэлюецца зь імкненьнем да ўлады, усё яшчэ блукае па пэўных частках нашае сьвядомасьці; з другога – ідэалёгія фронту сфармуляваная сёньня ў вельмі агульных рысах (маецца на ўвазе, у першую чаргу, фармуляваньне для грамадзкасьці, але таксама й для саміх сябе), што больш уласьціва для NGO, чым для палітычнае партыі. Натуральна, у цяперашніх варунках грамадзкія аб'яднаньні, калі іх параўноўваюць з партыямі, маюць пэўныя перавагі ў ажыцьцяўленьні сваёй дзейнасьці. Але мы ня мусім рабіць сябе закладнікамі гэтых перавагаў. Як Партыя БНФ у свой час была штучным утварэньнем пры БНФ "Адраджэньне" (і ўсе фронтаўцы ўсьвядамлялі гэтую штучнасьць), так і ГА БНФ "Адраджэньне" павінна пераўтварыцца ў штучную юрыдычную структуру пры Партыі БНФ. Прасьцей кажучы, мы мусім надалей самаўсьведамляць сябе не як грамадзкае аб'яднаньне, але як партыю. І дзеля гэтага трэба выразна акрэсьліць нашую ідэалёгію й пераасэнсаваць стаўленьне Фронту да ўлады.

Найвялікшай каштоўнасьцю БНФ ёсьць незалежная нацыянальная дзяржава, а галоўнай мэтай – адбудова такой дзяржавы ў паўнавартасным, а не фармальным выглядзе. Іншай самаўсьвядомленай і агульнапрызнанай каштоўнасьцю Фронту зьяўляецца беларуская культурная традыцыя – мова, гістарычная сымболіка, звычаі й г. д. Гэтыя прынцыпы агучваюцца ўва ўсіх праграмных дакумэнтах, сталі прысутнічаюць у рыторыцы нашых лідэраў і зьяўляюцца матывамі дзейнасьці для большасьці сябраў БНФ. Апроч таго, у грамадзкай сьвядомасьці Фронт успрымаецца як носьбіт менавіта гэтых каштоўнасьцяў. Фактычна, на сёньняшні момант ідэалёгія БНФ зьведзеная да добра распрацаваных прынцыпаў незалежнасьці, вызнаньня й прапаганды нацыянальных культуры й традыцыяў. Іншыя нашыя каштоўнасьці павінны быць фактычна "адроджаныя", сфармуляваныя наноў, больш выразна й канкрэтна, а таксама прасунутыя ў інфармацыйнае грамадзка-палітычнае поле Беларусі. Гэтыя каштоўнасьці мусяць быць ня проста прадэкляраваныя, іх трэба грунтоўна распрацаваць і прапагандаваць, паколькі яны ня ёсьць штучнымі, але складаюць аснову нашага сьветапогляду. У свой час БНФ даволі гучна выступаў супраць рознага кшталту сыстэмаў пераразьмеркаваньня, умяшаньня дзяржавы ў бальшыню сфэраў чалавечага жыцьця, абмежаваньня эканамічных свабодаў. Але тады гэтыя прынцыпы акрэсьлівалі выключна праз супрацьпастаўленьне іх камуністычным пастулятам. Рыторыка дзесяцігадовае даўніны наўрад ці можа натхніць цяперашняе грамадзтва. Іншыя каштоўнасьці, такія, як моцная сям'я, мясцовыя супольнасьці й іншыя пасярэдніцкія паміж дзяржавай і індывідам групы, маральнасьць, моцны, але невялікі ўрад, рэгіяналізм і дэцэнтралізацыя ўлады гучалі ў свой час няпэўна, хутчэй як даніна вобразу. Яны былі (і застаюцца) адарваныя ад грамадзка-палітычнага кантэксту, што абумовіла пэўную несур'ёзнасьць у стаўленьні да іх нават саміх фронтаўцаў. А ў апошнія гады яны амаль што наогул не гучалі ў інфармацыйна-ідэалягічнае прасторы. Разам з тым, наяўнасьць палітычнае пэрспэктывы Партыі БНФ палягае, у вялікай ступені, у прапагандзе й выкарыстаньні гэтых каштоўнасьцяў як сродкаў самаідэнтыфікацыі й пашырэньня кола сваіх выбарнікаў. Натуральна, калі сёньня апазыцыя заціснутая ў вельмі вузкі сэктар палітычнага поля, адрозьненьні паміж партыямі разгледзець амаль немагчыма: усе змагаюцца за дэмакратыю й незалежнасьць. Але гэты фактар зусім не зьяўляецца нагодай для таго, каб прымітывізаваць свае палітычныя погляды й мэты. Адразу па падзеньні рэжыму пытаньне ідэалёгіі паўстане вельмі востра, і працаваць над гэтым пытаньнем трэба ўжо цяпер.



Імкненьне да атрыманьня ўлады ва ўмовах існаваньня аўтарытарнага рэжыму пераўтвараецца ў задачу зьмены палітычнага ўладкаваньня краіны. Праблема для палітычных партыяў палягае ў тым, што іх прыход да ўлады магчымы толькі пры існаваньні збалянсаванае палітычнае сыстэмы. Але каб усталяваць такі баланс, трэба атрымаць уладу. Шанец выправіць сытуацыю мірным шляхам (а такі шлях – адзіны, бо грамадзянская вайна сталася б значна большай бядой для краіны, чым улада рэжыму ў яго сёньняшнім выглядзе) палягае ў тым, каб выкарыстаць у якасьці супрацьвагі рэжыму пратэст беларускага грамадзтва й міжнароднай супольнасьці. Пакуль гэтыя фактары ня стануць дастаткова важкімі, уплыў апазыцыі на палітычную сытуацыю істотна не павялічыцца. У гэтых варунках перад Фронтам мусяць стаяць дзьве тактычныя задачы:

- працаваць дзеля ўзмацненьня пратэставых настрояў у грамадзтве, набліжаючы зьмяненьне сытуацыі;
- рыхтавацца да раптоўных зьменаў.

Як сьведчыць гісторыя (у тым ліку й беларуская), ніхто, нават той, хто інсьпіруе палітычныя зьмены, ня можа прадбачыць іх глыбіню й дынаміку. Больш таго, вельмі цяжка прадбачыць сам момант пачатку пераменаў. І самае важнае ў такой сытуацыі - дакладна ведаць, што й як мусіць быць зроблена адразу. Фронту сёньня патрэбная праграма першачарговых крокаў у розных сфэрах палітыкі, эканомікі, бясьпекі й г. д.

БНФ мае структуру, якая мусіць рыхтаваць стратэгічныя праграмы – Ценевы Ўрад. Але сёньня ён фактычна ня дзейнічае. Неабходна аднавіць працу Ценевага Ўраду й прыцягнуць да працы ў ім, разам з наяўнымі, новых, маладых спэцыялістаў. Сталае функцыяваньне такой структуры ня толькі надасьць большае вагі Фронту ў сёньняшняй структуры апазыцыі й сярод насельніцтва, але й стане перадумовай прыходу БНФ да ўлады.

**Аляксей ЯНУКЕВІЧ,**
**сябра Сойму БНФ**

# Гарадзенскі БНФ заявіў пра байкот выбараў

*Гарадзенская арганізацыя БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ поўнасьцю падтрымлівае пазыцыю ўсяго БНФ і аб'яднанай апазыцыі датычна байкоту выбараў. Пра гэта заявіў старшыня Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі БНФ Сяргей Мальчык.*

Заява рэгіянальнай структуры (варта нагадаць, што гарадзенская Рада БНФ - адна з самых моцных у краіне) была афіцыйна агучаная падчас сустрэчы актывістаў гарадзенскай арганізацыі з дэлегацыяй кіраўніцтва БНФ, у якую ўваходзілі старшыня БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ Вінцук Вячорка, намесьнікі старшыні Юры Хадыка й Вячаслаў Сіўчык, а таксама сакратар Управы Юрась Пальчэўскі й прэсавы сакратар Аляксей Шэін. Адной з галоўных тэмаў сустрэчы было абмеркаваньне тактычных дзеяньняў аб'яднанай апазыцыі й БНФ увосень. Асноўная размова вялася наконт кампаніі байкоту выбараў, а таксама тычылася правядзеньня масавых акцыяў у 22-х гарадах краіны гэтай восеньню.

Вось меркаваньне старшыні БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ Вінцука Вячоркі: «Байкот ня мае на ўвазе пасіўнае нядзейнічаньне. Кампаніі выбарчага фарсу мы процістаўляем сваю актыўную працу. Нашыя актывісты будуць зьбіраць подпісы ў рамках кампаніі «Народны Рэфэрэндум» - за выкананьне рэжымам чатырох умоваў дзеля дэмакратычных выбараў. Гэтая восень будзе прэлюдыяй да кульмінацыйнага моманту - прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году».

Акрамя сустрэчы з гарадзенскімі актывістамі, кіраўніцтва БНФ правяло прэсавую канфэрэнцыю для журналістаў мясцовых незалежных СМІ. На пытаньне пра магчымы раскол апазыцыі журналісты пачулі адказ: «Аб'яднаная беларуская апазыцыя - гэта структурызаваны фэномэн. Яна (і тут няма чаго хаваць) не зусім супадае з КРДС. Гэта, перадусім, тыя сілы, якія вырашылі байкатаваць выбары».

**Андрэй УРБАНОВІЧ**

## НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ ПАРУШЭНЬНЯЎ

У ходзе кампаніі падрыхтоўкі восеньскіх "выбараў" у Гомельскай вобласьці назіральнікамі былі зафіксаваныя цікавыя факты. Перш за ўсё кідаецца ў вочы тое, што ў склад сфармаваных акруговых камісіяў у пераважнай бальшыні ўваходзяць прадстаўнікі мясцовай вэртыкалі, работнікі спэцслужбаў ці кіраўнікі прадпрыемстваў, якія знаходзяцца пад прамым падпарадкаваньнем адміністрацыяў раёнаў. Мясцовыя назіральнікі ўпэўненыя, што гэтыя камісіі цалкам кантралююцца ўладай. У склад камісіяў уваходзяць таксама прадстаўнікі некалькіх грамадзкіх арганізацыяў (у асноўным БПСМ, ПКБ, Беларускага грамадзкага аб'яднаньня вэтэранаў). Няма таксама інфармацыі пра знаходжаньне мясцовых выбарчых камісіяў, у некаторыя зь іх патрапіць амаль немагчыма. На зазначаным ў мясцовай газэце адрасе Буда-Кашалёўскай акруговай камісіі вісіць аб'ява, што яе адрас - кабінэт намесьніка старшыні выканкаму. Амаль тая ж сытуацыя і ў Калінкавічах, дзе шыльда прычэпленая да дзьвярэй актавай залі райвыканкаму. Інфармацыя аб знаходжаньні Петрыкаўскай і Жыткавіцкай акруговых камісіяў цалкам адсутнічае.

**BARC**

# СВАБОДА ВЫБАРУ

Рэпрэзэнтанты пастаўскіх дэмакратычных аб'яднаньняў сьцьвярджаюць, што ўжо на першых этапах правядзеньня "перадвыбарнай" кампаніі было дапушчана шмат сур'ёзных прававарушэньняў.

У Глыбокім група выбарнікаў сабрала патрэбную колькасьць подпісаў за вылучэньне ў склад выбарчай камісіі ў адной з акругаў мясцовага мэдыка, што прытрымліваецца дэмакратычных поглядаў. Але яго, як і шэраг іншых непажаданых у выбарчых камісіях асобаў, не зарэгістравалі без сур'ёзнай матывацыі. Праўда, каб канчаткова не выкрыць адкрытае самаўпраўства, у Віцебскай вобласьці ў склад камісіяў былі ўключаныя 9 прадстаўнікоў ПКБ і 4 актывісты ЛДПБ. Напрыклад, у Паставах выбарчы працэс арганізуюць праверанныя раней старшыня калгасу «Дружба» Б. Шылько і два пэнсіянэры-камуністы.

**BARC**



## ПОДПІСЫ ЗА ЎНІВЭРСЫТЭТ

У Жодзіне актывісты Таварыства Беларускай Мовы правялі збор подпісаў за адкрыцьцё Беларускага нацыянальнага ўнівэрсытэту. За кароткі час было сабрана больш за 140 подпісаў гараджанаў. Узельнікі акцыі таксама заклікалі мінакоў да няўдзелу ў кастрычніцкім выбарчым фарсе. У завяршэньне праграмы каля пятнаццаці сябраў арганізацыі, якія прымалі ўдзел у зборы подпісаў, урачыста прайшліся вуліцамі гораду да сядзібы ТБМ.

## ВІЦЕБКІЯ ДЭМАКРАТЫ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ У НАЗІРАНЬНІ ЗА ВЫБАРАМІ

У Віцебску прайшло чарговае паседжаньне Віцебскай каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў, сябры якой ухвалілі рашэньне аб'яднанай апазыцыі прыняць удзел у назіраньні за восеньскімі выбарамі. Па словах старшыні гарадской Рады БНФ "Адраджэньне" В. Шалухіна, назіраньне за выбарчым працэсам усебакова спрыяе байкатаваньню маючых адбыцца выбараў. На паседжанні Каардынацыйнай Рады было таксама вырашана распрацаваць тактыку агульнага байкоту, першым крокам у гэтым кірунку стане выпуск і распаўсюд адпаведнага агітацыйнага матэрыялу.

BARC



## АНАТОЛЬ ФЁДАРАЎ

*намесьнік Старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ*



*Нарадзіўся 21.01.1955 г. у шматдзетнай сялянскай сям'і ў в. Боўшава Магілёўскага раёну. Бацька - расеец, ураджэнец Архангельскай вобласьці. Маці - зь мясцовых беларускіх сялян.*

*У 1970 годзе, пасьля заканчэньня васьмігадовай школы, паступіў вучыцца ў Магілёўскі палітэхнікум, які закончыў у 1974 годзе.*

*З 1976 году працуе рабочым, а потым майстрам на Магілёўскім заводзе «Электрарухавік». У гэтым жа годзе паступае на завочнае аддзяленьне ў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут.*

*У 1977 годзе А. Фёдараў зь сям'ёй выяжджае па перасяленьню ў Амурскую вобласьць у адзін з тамтэйшых саўгасаў. Вяртаецца назад у 1979 г.*

*Працуе рабочым на чыгунцы, пазьней - майстрам у тэхнічнай вучэльні ў г. Магілёве.*

*У1988 годзе завяршае вучобу ў інстытуце.*

*У верасьні 1988 году ў Магілёве ўзьнікае першае нефармальнае аб'яднаньне культурніцкага кшталту. Анатоль Федараў бярэ чынны ўдзел у стварэньні й працы гэтага аб'яднаньня, адначасова робячы намаганьні дзеля стварэньня больш палітычна арыентаванай арганізацыі. Такой арганізацыяй становіцца Магілёўская філія гістарычна-асьветніцкага аб'яднаньня «Мартыралёг Беларусі».*

*У 1990 годзе становіцца дэпутатам Магілёўскага гарадзкога Савета.*

*1990-1994 гады - час станаўленьня шырокага дэмакратычнага руху на Магілёўшчыне. А. Фёдараў становіцца старшынём Магілёўскай гарадзкой (1990 год), а потым і Магілёўскай абласной арганізацыі БНФ «Адраджэньне» (1992 год).*

*У 1999-2000 гадах Анатоль Фёдараў садзейнічае пераменам у БНФ «Адраджэньне»; у якасьці намесьніка Старшыні арганізуе працу дзеля ўмацаваньня структураў Фронту, наладжваньня іх сумеснай працы, падвышэньня ролі рэгіянальных арганізацыяў.*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас: **220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

____________________________
(прозьвішча)

____________________________
(імя)

____________________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» ________________ 19__ г**

**жыве на адрасе:** ____________________
(індэкс і поўны адрас)

____________________________

**род заняткаў:** ____________________

**тэл.** ____________________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

____________ (дата)

____________ (подпіс)

НавіНЫ
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 7 (24), верасень 2000 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правох нумранай дакумэнтацыі

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net